______________________________________________________________
(mokykla)

______ klasės mokinio (-ės) ___________________________________________
(vardas ir pavardė)

# GIMTOJI KALBA (BALTARUSIŲ)

Mokyklinio brandos egzamino užduotis
Pagrindinė sesija

2024 m. gegužės 31 d. Trukmė – 4 val. (240 min.)

NURODYMAI

- Pasitikrinkite, ar egzamino užduočių sąsiuvinyje nėra tuščių lapų arba kito aiškiai matomo spausdinimo broko. Pastebėję praneškite egzamino vykdytojui.
- Užrašykite savo mokyklą, klasę, vardą ir pavardę tam skirtoje užduoties sąsiuvinio vietoje.
- Rašykite aiškiai, įskaitomai juodai arba mėlynai rašančiu tušinuku. Koregavimo priemonėmis naudotis negalima. Neaiškiai parašyti, pribraukyti, už ribų parašyti atsakymai vertinami 0 taškų.
- Atlikdami teksto suvokimo užduotis (II egzamino dalis), į klausimus atsakykite glaustai ir aiškiai. Jūsų atsakymai turi tilpti paliktose eilutėse.
- III egzamino dalyje pateiktos trys rašinio temos ir du tekstai interpretacijai. Įdėmiai juos perskaitykite, pasirinkite ir parašykite vieną rašinį arba vieną teksto interpretaciją.
- Turite parašyti 250–400 žodžių (A4 formato 1–2 puslapiai) tekstą. Vertinant bus atsižvelgiama ir į darbo apimtį. Švarraštyje suskaičiuokite žodžius. Paraštėje **pažymėkite 250 žodžių ribą**.
- Jeigu pirmiausia rašote juodraštyje, pasilikite pakankamai laiko darbui perrašyti į švarraštį. **Juodraštis nebus tikrinamas ir vertinamas**.

Linkime sėkmės!

VERTINIMAS

| II dalis (teksto suvokimas) | III dalis (teksto kūrimas) | TAŠKŲ SUMA |
|---|---|---|
| 30 taškų | 40 taškų | 70 taškų |
| | | |

Vertinimo komisija: ______________________________
(parašas, vardas ir pavardė)

______________________________
(parašas, vardas ir pavardė)

______________________________
(parašas, vardas ir pavardė)

II egzamino dalis

# TEKSTO SUVOKIMAS

*Прачытайце тэксты* А *і* Б *і выканайце змешчаныя пасля іх заданні.*

## Тэкст А

Мода будучыні...

Чаму Nike выпускае красоўкі з перапрацаваных пластыкавых бутэлек, а H&M шчыра інфармуе сваіх пакупнікоў пра змест шкодных хімічных рэчываў у сваіх матэрыялах?

Экалагічнасць сёння з'яўляецца модным трэндам. А пачалося ўсё з таго, што ў 2012 годзе "Грынпіс" выявіў сувязі некалькіх fashion-рытэйлераў* з фабрыкамі, якія забруджваюць рэкі Кітая. Было праведзена даследаванне, якое пацвердзіла наяўнасць у прадукцыі гэтых кампаній наніфенол-этаксілатаў (таксічных рэчываў). У ганебны спіс трапіў гігант causal-індустрыі**, другі па велічыні рытэйлер*** адзення H&M і буйнейшыя вытворцы спартыўнай вопраткі – Nike, Adidas і Puma.

Выбухнуў скандал. "Грынпіс" распачаў дэтокс-кампанію, заклікаючы фэшн-індустрыю адмовіцца ад тэхналогій, якія забруджваюць навакольнае асяроддзе. H&M згадзіўся абнародаваць дадзеныя пра ўсе хімічныя рэчывы, якія выкарыстоўваюць іх пастаўшчыкі пры вытворчасці матэрыялаў. Лідары рынка спартыўнай моды далучыліся да дэтокс-руху і абавязаліся выключыць небяспечныя рэчывы з усіх ланцугоў вытворчасці…

Адказныя кампаніі актыўна практыкуюць выкарыстанне другасных матэрыялаў, каб паменшыць колькасць смецця на планеце і зэканоміць прыродныя рэсурсы. Nike пачала вырабляць спартыўную форму з перапрацаваных пластыкавых бутэлек. Вытворчасць уключае збор бутэлек, ачыстку і пераплаўку.

Шматлікія вытворцы адзення прытрымліваюцца этычных прынцыпаў на ўсіх ступенях вырабу прадукцыі. Матэрыялы пастаўляюцца спецыяльнымі эка-фермамі, дзе вырошчваюць расліны і жывёлу без выкарыстання хімічных угнаенняў, генетычных і гарманальных стымулятараў. Пры гэтым фермы не выкарыстоўваюць паліўную энэргію і іншыя тэхналогіі, што забруджваюць навакольнае асяроддзе, а таксама забяспечваюць годныя ўмовы працы людзей на прадпрыемстве.

Эка-вопратка з-за асаблівасцей вытворчасці сёння даволі дарагая. Але з пераходам большасці брэндаў на зялёныя рэйкі канкурэнцыя ў гэтай сферы пабольшыцца, ды і тэхналогіі распрацуюцца. Таму людзям будучыні прырода будзе куды бліжэй да цела, чым нам.

Паводле: *Альбіна ТРУС* *https://dzecikava.org/2012/04/16/moda-buduchyni-pa-babchynyh-raceptah/*

*fashion-рытэйл – Fashion retail (рынак моднага адзення).

**causal-індустрыя – індустрыя моды.

***рытэйл – продаж тавараў канчатковаму спажыўцу (прыватнай асобе).

*Балы*
*I II III*

**1.** Карыстаючыся тэкстам, растлумачце сутнасць распачатай “Грынпіс” *дэтокс-кампаніі.*

______________________________________________

______________________________________________

*(1 бал)* ___ ___ ___

**2.** Назавіце прычыну, па якой “Грынпіс” распачаў дэтокс-кампанію.

______________________________________________

______________________________________________

*(1 бал)* ___ ___ ___

**3.** У чым сутнасць дэтокс-кампаніі для вытворцаў адзення і якую карысць прыносіць яна спажыўцам? Прывядзіце **тры** прыклады.

Для вытворцаў адзення:

1 – ______________________________________________

2 – ______________________________________________

Для спажыўцоў:

1 – ______________________________________________

*(3 балы)* ___ ___ ___

**4.** Пра якія **два** спосабы вытворчасці эка-вопраткі расказваецца ў тэксце?

1 – ______________________________________________

2 – ______________________________________________

*(1 бал)* ___ ___ ___

**5.** Што, на думку аўтара, зробіць у будучым эка-вопратку больш даступнай і таннай? Назавіце **дзве** прычыны.

1 – ______________________________________________

2 – ______________________________________________

*(1 бал)* ___ ___ ___

| Сума балаў за заданні 1–5 *(макс. 7 балаў)* | | | |
|---|---|---|---|

*Балы*
*I II III*

**6.** Выкажыце свае адносіны да эка-кампаній. Прывядзіце **два** аргументы, якія растлумачаць вашу пазіцыю.

Пазіцыя – ____________________

____________________

1-шы аргумент – ____________________

____________________

2-гі аргумент – ____________________

____________________

*(3 балы)* ___ ___ ___

**7.** Абапіраючыся на тэкст, запішыце **тры** асаблівасці эка-ферм.

1 – ____________________

____________________

2 – ____________________

____________________

3 – ____________________

____________________

*(1,5 бала)* ___ ___ ___

**8.** Вызначце стыль тэксту.

____________________

*(1 бал)* ___ ___ ___

**9.** Выпішыце з тэксту **чатыры** прыклады запазычаных слоў у пачатковай форме.

____________________

____________________

*(2 балы)* ___ ___ ___

| Сума балаў за заданні 6–9 *(макс. 7,5 балаў)* | | | |
|---|---|---|---|

## Тэкст Б

Выстаўка

Тою вясною неяк асабліва рана зацвілі ландышы. Яшчэ не паспела як след развінуцца клейкая маладая лістота на дрэвах, яшчэ ў гарадскіх скверах і парках не ўкрыла зямлю трава, а ўжо тыя ж бабулі, што не так даўно прадавалі пралескі, стаялі, трымаючы ў руках далікатныя букецікі ландышаў.

Якраз тою парою адкрылася ў Палацы мастацтваў выстаўка. Добра памятаю гэта, бо ўпершыню зайшла туды з духмяным белым букецікам. Я часта туліла яго да твару, адчуваючы незвычайна тонкі водар гэтых мілых кветак. Побач са мною быў Віктар. Ён глядзеў на мяне радаснымі вачыма, раз-пораз нахіляўся і шэптам пытаў: “Падабаецца?”

Мне ў той дзень падабалася ўсё. І белыя, цнатліва-чыстыя кветкі, і вясновы сонечны дзень, і вясёлыя ўзбуджаныя твары людзей. Я перажывала высокае, ні з чым не параўнанае ўзрушэнне. Здаецца, я ўпершыню была так моцна захоплена, зачаравана мастацтвам. То была мая першая сустрэча з сапраўдным майстрам. Так, так, першая. Тут найперш была роднасць, тут найперш было яднанне тваёй душы з тым светам, у які цябе нязмушана, але настойліва вёў мастак. Гэта быў твой свет. І было такое дзіўнае адчуванне, што ты калісьці ўжо жыў у гэтым свеце, бачыў і любіў гэтых людзей, але здарылася нейкая непапраўная бяда з тваёю душою, і ты надоўга забыў гэта ўсё, не думаў, не ўспамінаў яго, жыў з дня ў дзень дробным і мітуслівым жыццём, думаючы, што так і трэба, што гэта і ёсць тое тваё прызначэнне, дзеля якога ты і народжаны на белы свет.

Вялікі, нязнаны дасюль сорам падымаўся ў маёй душы і спапяляў усю істоту. Я пераходзіла ад карціны да карціны, як усё роўна ступала па распаленых камянях мінулага. Яно паўставала перад вачыма – шарачкова-беднае, гаротна-цяжкае, гераічна-мужнае. І тваё, тваё, тваё. Усё да самай кропелькі. Мастак міласціва вяртаў яго тваёй душы, як неразумна і балюча страчаны скарб, без якога і душа твая не душа, без якога і ты нечалавек.

Я памятаю, як выйшлі мы тады з палаца, як доўга маўчалі. Быў ужо вечар. Ціхі і цёплы. Улеглася дзённая вулічная мітусня, горад адпачываў. Загаварыў першы Віктар. І словы яго ўпалі нечакана, як халодныя кроплі дажджу. Мне захацелася схавацца ад іх, як-небудзь абараніцца. Я ўмольна ўзняла вочы: “Давай памаўчым, ладна?” Але ён не зразумеў мяне: “Чаму памаўчым... Ведаеш, ён, канешне, майстра. Нічога не скажаш. Тэхніка, вытанчанасць, усё такое. Але... Усё гэта так патрыярхальна, несучасна, так далёка ад нас. От, каб бабулю маю сюды – ёй бы якраз. А нам, нам ад мастацтва трэба іншае. Ну што хоць бы гэтыя партрэты сялян. Ну тыпы, ну й што. Мне трэба сённяшні чалавек, я хачу яго бачыць”. “А што значыць сённяшні?” – парывалася запытаць я, але не запытала, бо загадзя ведала, што ён адкажа. Нечакана захацелася астацца адной, і я паспяшалася развітацца. Ён пакрыўджана кіўнуў галавою, не азіраючыся, пайшоў па вуліцы. А я стаяла, чуючы, як горка пахнуць у маіх руках прывялыя без вады ландышы...

З таго часу я штодня, як толькі канчаліся ў інстытуце заняткі, адна ішла ў Палац мастацтваў. Я ўглядвалася ў твары сваіх продкаў. У кожную іх рысачку. Я пазнавала іх. Мудрых, стомленых жыццём і працаю, але ўчэпістых, цягавітых, з неспатольнаю прагаю жыцця ў спакойных вачах.

https://karotkizmest.by

*Балы*
*I II III*

**10.** Сфармулюйце тэму тэксту.

____________________________________________________________

____________________________________________________________

*(1 бал)*

**11. 1** Як мяняецца настрой гераіні ў тэксце?

Спачатку настрой ____________________________________________

____________________________________________________________

У канцы твора _______________________________________________

____________________________________________________________

*(1 бал)*

**11.2** Выпішыце з тэксту эпітэты, якія дапамагаюць аўтару паказаць гэтую змену настрою.

Настрой гераіні ў пачатку тэксту:

1 – ________________________________________________________

2 – ________________________________________________________

3 – ________________________________________________________

Настрой гераіні ў канцы тэксту:

1 – ________________________________________________________

*(2 балы)*

**12.** Выпішыце сказ, які паказвае, што гераіні вельмі блізкая тэматыка карцін, змешчаных на выставе.

____________________________________________________________

*(0,5 бала)*

**13.** Чым так захапілі, зачаравалі гераіню пабачаныя на выставе творы мастацтва? Адкажыце словамі тэксту.

____________________________________________________________

____________________________________________________________

*(0,5 бала)*

| Сума балаў за заданні 10–13 *(макс. 5 балаў)* | | | |
|---|---|---|---|

| | Балы | | |
|---|---|---|---|
| | I | II | III |
| **14.** Што адчувае гераіня пасля выхаду з мастацкай выстаўкі? Падкрэсліце правільныя варыянты адказаў.<br><br>*Натхненне; духоўнае ўзрушэнне; расчараванне; разгубленасць; высокае, ні з чым не параўнальнае перажыванне.*<br><br>*(1 бал)* | ___ | ___ | ___ |
| **15.** Як сустрэча з мастацтвам мяняе светапогляд гераіні? Пазначце правільны варыянт адказу.<br><br>**А** Не аказвае значнага ўплыву на яе светапогляд.<br>**Б** Пераконвае яе ў неабходнасці перамен у грамадстве.<br>**В** Прымушае сумнявацца ў каштоўнасці традыцыйнага мастацтва.<br>**Г** Дапамагае ёй адчуць сувязь з мінулым, прыналежнасць да свайго роду.<br><br>*(1 бал)* | ___ | ___ | ___ |
| **16.** Што ў словах Віктара пра пабачаныя творы мастацтва так расстроіла гераіню?<br><br>______________________________<br>______________________________<br><br>*(1 бал)* | ___ | ___ | ___ |
| **17.** Растлумачце сэнс параўнання ў сказе *І словы яго ўпалі нечакана, як халодныя кроплі дажджу.*<br><br>______________________________<br>______________________________<br><br>*(1 бал)* | ___ | ___ | ___ |
| **18.** Якой бачыць ролю мастацтва ў жыцці аўтар урыўка? Пазначце правільны варыянт адказу.<br><br>**А** Аўтар не дае выразнага адказу.<br>**Б** Мастацтва – гэта забава і магчымасць весела правесці час.<br>**В** Мастацтва павінна адлюстроўваць сучасныя рэаліі і вырашаць сацыяльныя праблемы.<br>**Г** Мастацтва дапамагае нам зразумець сябе, знайсці сувязь з мінулым і сучаснасцю, перажыць моцныя эмоцыі.<br><br>*(1 бал)* | ___ | ___ | ___ |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Сума балаў за заданні 14–18 *(макс. 5 балаў)* | | | |

**19.** Пазначце выказванні, якія не адпавядаюць зместу тэксту.

*Балы* *I II III*

**А** Героі былі на выстаўцы да самага вечара.

**Б** Падзеі ў творы адбываюцца ў пачатку восені.

**В** Віктару і гераіні спадабаліся розныя карціны.

**Г** Выстаўка фатаграфій праходіла ў Палацы мастацтваў.

**Д** Віктар і гераіня доўга маўчалі, выйшаўшы з выставы.

**Е** Гераіня перажывала высокае, ні з чым не параўнанае ўзрушэнне.

*(1,5 бала)* ___ ___ ___

**20.** Выпішыце з тэксту па **два** прыклады слоў, якія ілюструюць наступныя асаблівасці беларускай мовы:

яканне: ____________________

дзеканне: ____________________

цеканне: ____________________

падаўжэнне зычных: ____________________

*(4 балы)* ___ ___ ___

| Сума балаў за заданні 19–20 *(макс. 5,5 бала)* | | | |
|---|---|---|---|

**АЦЭНКА ВЫКАНАННЯ ТЭСТА**

| II частка (тэст) | Макс. сума | Члены камісіі | | |
|---|---|---|---|---|
| | | I | II | III |
| Сума балаў за заданні 1–5 | 7 | | | |
| Сума балаў за заданні 6–9 | 7,5 | | | |
| Сума балаў за заданні 10–13 | 5 | | | |
| Сума балаў за заданні 14–18 | 5 | | | |
| Сума балаў за заданні 19–20 | 5,5 | | | |
| **Сума балаў** | 30 | | | |
| **Акругленая сума балаў** | 30 | | | |

III egzamino dalis

# TEKSTO KŪRIMAS

*З прапанаваных трох тэм сачыненняў і двух тэкстаў для інтэрпрэтацыі Вы павінны выбраць адну тэму альбо адзін тэкст і напісаць працу.*

*Ваша праца павінна быць аб'ёмам 250–400 слоў (1–2 старонкі фармата А4). У чыставіку ад пачатку працы адлічыце 250 слоў, пазначце месца, дзе яны заканчваюцца, і запішыце гэтую колькасць на палях.*

## ТЭМЫ САЧЫНЕННЯЎ

**1.** "Датуль не знікне хараство, пакуль яго шукаюць людзі" (І. Багдановіч). Тэма мастака і мастацтва ў творах беларускіх пісьменнікаў.

**2.** Паміж пачуццём і абавязкам (па апавяданнях М. Зарэцкага).

**3.** Трагедыя "вялікага пералому" ў асэнсаванні В. Быкава (па аповесці В. Быкава "Аблава").

## ТЭКСТЫ ДЛЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ

**4.** У. Ліпскі

Мудры – хто вучыцца ва ўсіх, усюды, заўсёды.
Багаты – хто жыве на сродкі, якія ёсць.
Шчаслівы – хто жадае быць шчаслівым.
Вольны – хто ўмее лавіць чароўнасць.
Моцны – хто памагае слабаму.
Карысны – хто працуе не на сябе.
Міласэрны – хто ўпускае ў сэрца чужое гора.
Праведны – хто шануе душу.
Вечны – каго помняць.
Кім хочаш быць, тым і будзь!
А хочаш вечнасці – будзь мудрым,
Багатым, шчаслівым, вольным,
Святочным, моцным,
Карысным, міласэрным, праведным.

**5.** У. Караткевіч

**Мова**

*Янку Брылю*

Ёсць паданне вякоў, што разбурыць калісь
Вавілонскую Вежу Адам,
І няўмольна сальюцца мовы зямлі
У адну, няродную нам.
І мая безвыходна пойдзе у змрок,
У атрутны, як вечнасць, цень,
Трапяткая і сіняя, як васілёк,
Гарачая, як прамень.
Я ні шчасця, ні будучых дзён не жадзён,
Хай пятля, хай памерці ў журбе,
Хай не будзе ні шчасця, ні будучых дзён,
Калі ў іх не будзе цябе.
Сірата па з'едлівай волі багоў,
Гінучы мой карабель,
Хай не будзе світання ў народа майго,
Калі досвіткам здрадзіць табе.
Ад палеткаў райскіх лёгкай ступой
Збочу я да пякельных катлоў,
Калі першы жа ангел на мове маёй
Мне не скажа: "Братка, здароў".
І няхай да мяне не прыйдзе вясна,
Песня, шчасце, каханне, спакой,–
Ўсё адно не змяняю твой чорны праснак
На атруту пшаніцы чужой.
Ты мой ясны хлеб і каханы май,
Песня продкаў, нашчадкаў палі,
Без цябе, не з табой – не патрэбен мне рай
На душы. Ў небясі. На зямлі.
*1958–1959?*

# ЧАРНАВІК

*Працяг чарнавіка на 12-й старонцы*

## ЧЫСТАВІК

*I* *II* *III*

***Працяг чыставіка на 13-й старонцы***

***Працяг чарнавіка***

***Працяг чарнавіка на 14-й старонцы***

***Працяг чыставіка***

*I* *II* *III*

***Працяг чыставіка на 15-й старонцы***

***Працяг чарнавіка***

***Працяг чыставіка***

*I* *II* *III*

| III частка (сачыненне) | | | | Сума балаў |
|---|---|---|---|---|
| **Змест** | **Структура тэксту** | **Стыль мовы** | **Граматнасць** | |
| 20 балаў | 4 балы | 4 балы | 12 балаў | 40 балаў |
| | | | | |